***HARMATNY V.P.* NEP in Belarus (1921–1927)**

In the beginning of 1920-ies the economy of BSSR was totally destroyed especially agriculture. New Economical Policy (NEP) was proclaimed with aim of rebirth of destroyed economy. Thanks for NEP economy were partly increased but such policy was finished because it looks like capitalism.

УДК 94(4)|1914/1918|(=470.41)

***Грыбава С.У.***

# БЕЛАРУСКІЯ ТАТАРЫ Ў ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЕ

З моманту з'яўлення прадстаўнікоў татарскага этнаса на тэрыторыі Беларусі, што адбылося больш чым 600 гадоў таму назад, у часы існавання Вялікага княства Літоўскага, значнае месца ў іх асяродку займала вайсковая служба. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі дадзеная тэндэнцыя працягвала існаваць. У артыкуле размова пойдзе аб генералах з ліку татарскага насельніцтва беларускіх зямель на службе ў расійскай арміі, якія прымалі ўдзел у Першай сусветнай вайне.

Ваенныя з беларускіх татараў падчас згаданай вайны ўдзельнічалі ў арганізацыі мусульманскіх воінскіх часцей. У пачаўшымся фарміравацца летам 1917 г. на румынскім фронце 1-м мусульманскім корпусе яны складалі даволі значную частку. Ініцыятыва стварэння корпуса належыла генералу Мацею Сулькевічу, які і ўзначаліў яго (дарэчы, у «Известиях» Усерасійскай Мусульманскай Рады згадваецца аб стварэнні Сулькевічам у складзе корпуса трох дэвізій) [1, s. 248]. Мацей Сулькевіч нарадзіўся 20 ліпеня 1865 г. у сям'і дваран Віленскай губерні. Яго жыццёвы шлях быў прадвызначаны загадзя: бацька, Аляксандр Сулькевіч, быў палкоўнікам гусарскага палка і з малых гадоў Мацей выхоўваўся як будучы воін.

Пачатковую ваенную адукацыю М. Сулькевіч атрымаў у Варонежскім кадэцкім корпусе і Міхайлаўскай артылерыйскай школе. Яму не было яшчэ і 30 гадоў, калі ён скончыў у 1894 годзе Акадэмію генеральнага штаба Расійскай імперыі. Службу ў царскай арміі ён пачаў у 1883 г., а ў 1886 г. атрымаў першы афіцэрскі чын. У 1910 г. атрымаў званне генерал-маёра, а ў перыяд Першай сусветнай вайны – у 1915 г.– генерал-лейтэнанта.

М. Сулькевіч удзельнічаў у руска-кітайскай (1900–1901 гг.) і ў руска-японскай (1904–1905 гг.) войнах.

З першых дзён ўступлення Расійскай імперыі ў сусветную вайну генерал Мацей Сулькевіч знаходзіўся ў дзеючай арміі: спачатку на пасадзе начальніка штаба корпуса, затым на пасадах камандзіра 3-й пяхотнай дывізіі і камандзіра 37-га пяхотнага корпуса на Паўночным фронце.

За час службы ў царскай арміі М. Сулькевіч атрымаў мноства баявых узнагарод: ордэн Св.Станіслава, Св.Ганны 2-й ступені, Св.Уладзіміра 4-й ступені, Св.Уладзіміра 3-й ступені і інш.

Генерал Сулькевіч быў вядомы і як ваенны тэарэтык – артыкулы Сулькевіча па тэорыі і практыцы ваеннага майстэрства былі сабраныя і апублікаваныя ў двухтомніку, які карыстаўся поспехам не толькі ў Расіі, але і ў шэрагу еўрапейскіх краін. Трэба адзначыць, што татарын-мусульманін М. Сулькевіч, акрамя ваеннай справы, цікавіўся і папулярызаваў гісторыю, рэлігію і этнаграфію свайго народа. У 1902 г. ён на свае сродкі апублікаваў у друкарні Адэскай ваеннай акругі кнігу польскага арыенталіста, прафесара Пецярбургскага ўніверсітэта А. Мухлінскага «Даследаванне паходжання і становішча літоўскіх татараў» і напісаў уступ да гэтай кнігі [1, s. 248].

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі М. Сулькевіч з'ехаў у Крым. Імкнуўся да стварэння незалежнай крымскай дзяржавы. Пры падтрымцы германскіх войскаў, якія акупавалі паўвостраў ў красавіку 1918 г, сфармаваў Крымскі краявы ўрад, дзе заняў пасаду прэм'ер-міністра, міністра ўнутраных спраў і ваеннага міністра. Аднак гэты ўрад праіснаваў нядоўга. Адразу пасля выгнання германскіх войскаў у канцы кастрычніка 1918 г. Добраахвотніцкай арміяй А. Дзянікіна (пры падпрымцы саюзных французскіх і англійскіх войскаў) урад Сулькевіча быў распушчаны [2, s. 102]. М. Сулькевіч і яго паплечнікі пакінулі Крым і знайшлі прытулак у Азербайджане, дзе таксама прымалі актыўны ўдзел у палітычным жыцці. Мацей Сулькевіч меў дачыненне да арганізацыі азербайджанскай арміі, стаў ваенным міністрам. Але яго лёс склаўся трагічна: пасля захопу Баку бальшавікамі ён быў арыштаваны і расстраляны [3. с. 142].

Сваё жыццё прысвяціў вайсковай справе і Талькоўскі Аляксандр (Іскандэр) Асманавіч, які нарадзіўся 14 мая 1858 г. у Віленскай губерніі. Адукацыю атрымаў у прыватным рэальным вучылішчы Цэрбоўскага. Пасля заканчэння якога ў 1873 г. вырашыў ўступіць на службу ў армію, быў залічаны ў 107 Пяхотны Траецкі полк. Камандаванне, ацаніўшы здольнасці Талькоўскага, накіравала яго ў жніўні 1874 г. у Віленскае пяхотнае юнкерскае вучылішча. Пасля заканчэння якога у 1876 г., Іскандэр Асманавіч вярнуўся ў свой полк. Праз год атрымаў званне прапаршчыка і быў прыкамандзіраваны да 9-га Грэнадзёрскага Сібірскага палка, у складзе якога прымаў удзел у руска-турэцкай вайне 1877–78 гг. Падчас вайны 16 лютага 1878 г. ён атрымаў сваю першую ўзнагароду – ордэн Св. Ганны 4-й ступені (за ўзяцце Плеўны), у красавіку гэтага ж года яму прысвоілі чарговае воінскае званне падпаручыка. Пасля вайны Талькоўскі быў накіраваны ў свой полк, дзе ён праслужыў на працягу 7 гадоў у якасці камандзіра роты і ў званні паручыка, і быў адзначаны румынскім крыжом у памяць вайны з Турцыяй.

За час службы ў палку адбыліся змены ў асабістым жыцці. Ён жаніўся на дачцэ ротмістра-татарына Лізавеце Сцяпанаўне Сулькевіч. У іх сям'і нарадзілася дзве дачкі і два сыны (адзін з якіх – Аляксандр – у свой час будзе генералам Чырвонай Арміі, падрабязней аб яго лёсе размова пойдзе ніжэй).

Улетку 1885 г. Талькоўскі падаў прашэнне аб пераводзе яго ў пагранічную варту, якое было задаволена. Яго служба ў Асобным корпусе пагранічнай варты працякала вельмі паспяхова. Руплівасць і стараннасць Талькоўскага былі не толькі заўважаны, але і адзначаны ў гэты перыяд трыма ўзнагародамі: ордэнамі Св. Станіслава 3-й ступені, Св. Ганны 3-й ступені і срэбным медалём у памяць царствавання імператара Аляксандра III.

36-гадовага ротмістра шанавалі не толькі за чалавечыя якасці, але і дзелавыя. Сведчаннем гэтага з'яўляецца яго камандзіраванне ў штаб Асобнага корпуса пагранічнай варты ў склад камісіі па распрацоўцы Палажэння аб кіраванні корпусам. Пасля завяршэння працы А.А. Талькаўскага пакінулі ў штабе корпуса. 1897 год прынёс яму новыя ўзнагароды: ордэн Св. Станіслава 2-й ступені і срэбны медаль у памяць каранавання імператара Мікалая II. 1 студзеня 1898 г. І.А. Талькоўскі прызначаны памочнікам старшага ад'ютанта штаба Корпуса пагранічнай варты. Праз тры месяцы яму прысвоілі чарговае званне падпалкоўніка. У красавіку 1901 г. ён быў узведзены ў палкоўнікі, а 25-гадовая служба адзначана ордэнам Св. Уладзіміра 4-й ступені. У снежні 1902 г. Талькоўскі атрымаў пасаду камандзіра Асобага Керчанскага аддзела. Яму даручалі весці сакрэтныя дазнанні. Яго заслугі былі адзначаны ў красавіку 1905 г. ордэнам Уладзіміра 3-й ступені, а ў чэрвені 1906 – пасадай камандзіра Чарнаморскай брыгады. Падчас службы на гэтай пасадзе Талькоўскі

***Грибова Светлана Владимировна****, ст. преподаватель кафедры социально-политических и исторических наук Брестского государственного технического университета.*
*Беларусь, БрГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*

ў снежні 1910 г. атрымаў званне генерал-маёра. 31 мая 1912 г. ён быў прызначаны камандзірам 4-й пагранічнай Рыжскай брыгады.

У пачатку Першай сусветнай вайны, пасля абвяшчэння агульнай мабілізацыі, Рыжская брыгада ўвайшла ў склад Рыга-Шавельскага атрада і трапіла ў падпарадкаванне камандзіра XX армейскага корпуса. 18 ліпеня 1914 г. пачалася мабілізацыя брыгады, якая ў хуткім часе перайшла ў распараджэнне каменданта Усць-дзвінскай крэпасці [4].

У канцы студзеня 1915 г. генерал прызначаны начальнікам гарнізона горада Віндавы і Віндаўскага атрада, а затым начальнікам Віндаўскага раёна аховы Балтыйскага ўзбярэжжа. Вёў барацьбу з ворагам, стрымліваючы націск германскага флота.

18 лютага 1916 г. Талькоўскі быў залічаны ў рэзерв чыноў пры штабе Петраградскай ваеннай акругі з камандзіраваннем ў распараджэнне камандуючага 5-й арміяй. 14 мая 1916 г. за выдатную службу падчас ваенных дзеянняў быў узнагароджаны ордэнам Св.Станіслава 1-й ступені.

Пасля рэвалюцыйных падзей у кастрычніку 1917 г. цалкам прыняў бок Савецкай улады. У рэзерве Чырвонай Арміі генерал знаходзіўся да лета 1918 г. З чэрвеня гэтага года да студзеня 1919 г. зноў камандаваў брыгадай, а затым быў накіраваны ў Казань для падрыхтоўкі нацыянальных кадраў Чырвонай Арміі, дзе ён загадваў Першымі Казанскімі мусульманскімі пяхотнымі камандзірскімі курсамі.

У жніўні 1920 г. Талькоўскі пераехаў у Баку, дзе ўзначальваў ваенную школу, чакаючы загад аб звальненні з войска (па хваробе). Працяглая 47-гадовая ваенная служба адбілася на яго здароўі. Сыдучы з ваеннай школы, Іскандэр Асмановіч з 27 студзеня 1921 г. працаваў начальнікам архіва штаба 11-й арміі. У гэтым жа годзе генерал І.А. Талькоўскі памёр ва ўзросце 62 гадоў.

Як ужо адзначалася вышэй, сын Іскандэра Асманавіча Талькоўскага – Аляксандр – таксама сваё жыццё звязаў з ваеннай справай. У 1913 г. ён скончыў Аляксандраўскую гімназію ў г. Рызе і ў гэтым жа годзе паступіў на сапраўдную ваенную службу юнкерам ў Паўлаўскае вайсковае вучылішча г. Пецярбурга.

1 кастрычніка 1914 г. у сувязі з пачаткам Першай сусветнай вайны Аляксандр датэрмінова выпусціўся з вучылішча. Яму прысвоілі афіцэрскае званне падпаручыка і прызначылі камандзірам паўроты ў запасны батальён Паўлаўскага лейб-гвардзейскага палка 2-й Гвардзейскай пяхотнай дывізіі. У студзені 1915 г. І. Талькоўскі быў камандзіраваны з маршавай ротай у дзеючую армію. У 1915, 1916 і 1917 гадах на фронце ў Паўлаўскім палку паслядоўна займаў пасады камандзіра паўроты, начальніка каманды конных разведчыкаў і камандзіра батальёна, бесперапынна ўдзельнічаючы ў баях на Паўночна-Заходнім, Заходнім і Паўднёва-Заходнім франтах пад Ламярай, Холмам, Брэст-Літоўскам, Вільняй, Ашмянамі, Усць-Дзвінскам, Луцкам і Тарнопалям. За храбрасць і адвагу ў Першай сусветнай вайне быў ганараваны баявымі ўзнагародамі.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, перайшоўшы на бок Чырвонай Арміі, па загаду Мусульманскага ваеннага савета пры Пецярбургскім Савеце рабочых і салдацкіх дэпутатаў І. Талькоўскі быў камандзіраваны ў распараджэнне камандуючага Петраградскай ваеннай акругай для фарміравання нацыянальных часцей РСЧА [5].

У 1917–1918 гг. – камандзір мусульманскага палка 1-й Петраградскай стралковай дэвізіі. У 1919 г. у Казані – начальнік стралковай часці 2-х мусульманскіх камандзірскіх курсаў. Падчас Грамадзянскай вайны ў 1919–1920 г. – начальнік штаба 1-й Асобнай Прыволжскай татарскай стралковай брыгады. З сакавіка 1920 г. І.І. Талькоўскі камандаваў 4-й і 6-й Туркестанскімі асобнымі стралковымі брыгадамі ў Фергане і Сямірэччы. З 1923 г. – начальнік і камісар аб'яднанай Татара-Башкірскай ваеннай школы, з 1931 г. – камандзір і ваенкам 3-й стралковай Крымскай дэвізіі. Аднак лёс генерала Чырвонай Арміі І.І. Талькоўскага склаўся трагічна. У 1937 г. ён быў рэпрэсіраваны, у 1940 г. судовую справу па яго абвінавачванні спынілі. Аднак 30 чэрвеня 1941 г. яго ў другі раз арыштавалі за ўдзел «у антысавецкай ваеннай змове і рабоце на германскую разведку» [6, с. 119]. 23 лютага 1942 г. яго расстралялі. У 1956 г. А.І. Талькоўскі быў рэабілітаваны [7, s. 7].

Сваё жыццё падчас абароны краіны у Першай сусветнай вайне аддаў беларускі татарын генерал Канстанцін Якаўлевіч Біцютка. Ваенную адукацыю ён пачаў у 2-м Маскоўскім кадэцкім корпусе. Скончыў 3-е Ваеннае Аляксандраўскае вучылішча (1886), пазней у 1892 г. навучаўся ў Мікалаеўскай акадэміі генеральнага штаба. Сваю службу у арміі ён пачаў у жніўні 1884 г. У снежні 1904 г. атрымаў чын палкоўніка. Прымаў удзел у руска-японскай вайне 1904–1905 гг., будучы начальнікам штаба 55-й пяхотнай дывізіі. У сакавіку 1913 г. быў узведзены ў чын генерал-маёра, з гэтага ж часу – начальнік штаба 1-га Туркестанскага армейскага корпуса. З лістапада 1915 г. – камандуючы 3-й Каўказскай стралковай дывізіяй. Улетку 1916 г. падчас Першай сусветнай вайны К.Я. Біцютка быў забіты на перадавых пазіцыях дывізіі. Пасмяротна ўзведзены ў чын генерал-лейтэнанта. За час службы ў арміі Канстанцін Якаўлевіч Біцютка ганараваўся ордэнамі: Св. Станіслава 3-й ступені (1898); Св. Ганны 3-й ступені (1902); Св. Станіслава 2-й ступені (1906); Св. Уладзіміра 4-й ступені (1906); Св. Уладзіміра 3-й ступені (1909); Св. Станіслава 1-й ступені (1915/05/01); Св. Ганны 1-й ступені (1915/06/12) [8; 9, с. 54].

Удзельнікам Першай сусветнай вайны быў і беларускі татарын, ураджэнец Лідскага павета, Аляксандр Рамуальдавіч Рамановіч (1871–1933). Навучаўся ён у Полацкім кадэцкім корпусе. На службу ўступіў у канцы верасня 1890 г. Зкончыў Мікалаеўскае кавалерыйскае вучылішча, пасля чаго быў накіраваны ў лейб-гвардзейскі Драгунскі полк, даслужыўся да палкоўніка (12.06.1913 г.). У складзе гэтага ж палка ўдзельнічаў у Першай сусветнай вайне. З 28 мая 1915 – камандзір 12-га Калішскага коннага палка пагранічнай варты. У жніўні 1917 г. Аляксандр Рамуальдавіч Рамановіч атрымаў чын генерал-маёра, а з кастрычніка гэтага ж года камандаваў Фінляндскай пагранічнай зводнай дывізіяй. За тэрмін службы ў арміі Расійскай імперыі ён быў узнагароджаны ордэнамі: Св. Ганны 3-й ступені (1906), Св. Станіслава 2-й ступені (1909), Св. Ганны 2-й ступені (1913), Св. Уладзіміра 4-й ступені (1914/10/26) [10].

Пасля змены ўлады ў краіне ў выніку рэвалюцыйных падзей, ён эмігрыраваў у Польшчу, дзе актыўна ўдзельнічаў у грамадскім і рэлігійным жыцці мусульманскай абшчыны. У гэты час у II Рэчы Паспалітай пачынаўся працэс нацыянальна-культурнага адраджэння татарскай дыяспары, гэта датычылася і ваеннай справы. У пачатку 20-х гг. XX ст. паўстала пытанне аб аднаўленні спрадвечнай традыцыі татараў – вайсковай службы ў межах татарскага ваеннага фарміравання. З дадзенай прапановай да ўлад звярнуліся татарскія дзеячы, на што атрымалі станоўчы адказ. Спачатку была створана татарская конніца (кавалерыя), якая 3 лютага 1920 г. была пераўтворана ў Татарскі Полк уланаў імя Мустафы Ахматовіча. Дадзены полк ўзначаліў Аляксандр Рамановіч [11, s. 43]. У красавіку 1920 г. Татарскі Полк увайшоў у склад 7-й коннай брыгады, камандаване якой было даручана А.Р. Рамановічу. Падчас савецка-польскай вайны брыгада ўдзельнічала ў баях на Украіне [12, с. 434–436]. У красавіку 1921 г. А.Р. Рамановіч пайшоў у адстаўку ў чыне генерала брыгады. Пасяліўся ў Вільні, дзе і памёр. Пахаваны ў сямейным магільным склепе на могілках у Некрашунцах у Лідскім раёне.

Даслужыўся да генерал-лейтэнанта ў складзе расійскай арміі і прымаў удзел у Першай сусветнай вайне беларускі татарын, родам з дваран Гродзенскай губерні, Юзэфавіч Якаў Давідавіч (1872–1929). Адукацыю атрымаў у Міхайлаўскім артылерыйскім вучылішчы (1893) і Мікалаеўскай акадэміі Генштаба (1899). Удзельнічаў ў руска-японскай вайне 1904–1905 гг. Яго ваенная кар'ера развівалася імкліва. Падчас Першай сусветнай вайны з 15.06.1917 г. па 07.09.1917 г. Я.Д. Юзэфавіч – камандуючы 12-й кавалерыйскай дывізіяй. Затым прызначаны камандзірам 26-га армейскага корпуса, з 09.09.1917 г. таксама камандаваў 12-й арміяй. 14.11.1917 г. – прызначаны камандуючым Паўночнага фронту. За час службы ў царскай арміі Я.Д. Юзэфавіч атрымаў наступныя ўзнагароды: ордэны Св. Станіслава 3-й ступені (1904), Св. Ганны 3-й ступені (1905), Св. Станіслава 2-й ступені (1906), Св. Уладзіміра 4-й ступені (1907), Св. Ганны 2-й ступені (1907), Св. Уладзіміра 3-й ступені (1911/12/06), Георгіеўскай зброяй (1916/02/07) і ордэнам Св. Георгія 4-й ступені (1916/03/01), а таксама Св. Станіслава 1-й ступені (1916/06/02), Св. Ганны 1-й ступені (1916/12/10).

Я.Д. Юзэфавіч удзельнічаў у Грамадзянскай вайне ў складзе Добраахвотніцкай арміі (з сярэдзіны 1918 г.). Са студзеня 1919 г.

займаў пасаду начальніка штаба Каўказскай Добраахвотніцкай арміі генерала П. Урангеля. Падчас хваробы апошняга Я.Д. Юзэфавіч замяшчаў яго на пасадзе камандуючага арміяй. З лета 1919 г. і да 28.11.1919 г. – камандзір 5-га коннага корпуса. З красавіка 1920 г. Я.Д. Юзэфавіч кіраваў працамі па ўмацаванні Перакопа (горад на Перакопскім пярэсмыку, які неаднаразова падвяргаўся нападам Чырвонай Арміі) і будаўніцтвам чыгункі Джанкой – Юшунь, неабходнай для патрэб фронту. З 22.05.1920 г. выконваў функцыі інспектара кавалерыі ў Рускай арміі генерала П. Урангеля. Пасля перамоваў у Парыжы генерала Я.К. Міллера і рускага пасла В.А. Маклакова з французскім урадам і прадстаўнікамі Польшчы аб фарміраванні 3-й Рускай арміі на тэрыторыі Польшчы Я.Д. Юзэфавіч выехаў 17.09.1920 г. у Парыж. Ён суправаджаў міністра замежных спраў П.Б. Струве, каб у далейшым узначаліць 3-ю Рускую армію, да фарміравання якой прыступіў генерал П.С. Махроў. Аднак Рыжскі мір Польшчы з Савецкай Расіяй спыніў гэтыя намеры П. Урангеля. З лістапада 1920 г. жыў у эміграцыі (Германія, Польшча, Францыя, Эстонія). Памёр у г. Тарту (Эстонія) у 1929 г. [13].

Такім чынам, беларускія татары прымалі актыўны ўдзел у ваенных падзеях падчас Першай сусветнай вайны. Па некаторых дадзеных, у гэты час на службе ў расійскай арміі колькасць генералаў татарскага паходжання родам з беларускіх зямель складала 18 чалавек, палкоўнікаў, старшых і малодшых афіцэраў былі сотні [3, с. 142]. Некаторыя загінулі падчас баявых дзеянняў, змагаючыся на франтах вайны супраць агульнага ворага. Аднак пасля рэвалюцыйных падзей у Расійскай імперыі ваенна-палітычныя прыярытэты беларускіх татараў не былі аднолькавыя, яны выказалі падтрымку розным палітычным сілам і адстойвалі свае інтарэсы ў розных накірунках. Некаторыя перайшлі на бок новай – Савецкай улады, і ваявалі ў шэрагах Чырвонай Арміі, некаторыя працягвалі барацьбу ў складзе Белага руху, пэўная частка беларускіх татараў стала на шлях ажыццяўлення нацыянальных інтарэсаў татараў Крыма, некаторыя, апынуўшыся ў эміграцыі ў Польшчы, прымалі актыўны ўдзел у культурна-рэлігійным адраджэнні татарскай дыяспары ІІ Рэчы Паспалітай.

**СПІС ЦЫТАВАНЫХ КРЫНІЦ**


1. Arslan-Bej. General Maciej Sulkiewich / Arslan-Bej // Rocznik Tatarski. – 1932. – T. I – S. 247–255.
2. Tyszkiewicz, J. Z historii tatarow polskich 1794–1944 / J. Tyszkiewicz. – Pultusk, 1998. – 176 s.
3. Думін, С.У. Беларускія татары: мінулае і сучаснасць / С.У. Думін, І.Б. Канапацкі. – Мінск: Полымя, 1993. – 206 с.
4. Гришин, Я. Безупречный генерал Искандер Тальковский / Я. Гришин // науч.-дакум. журн. «Эхо веков» [Электронный ресурс]. – 1997. – № 2. – Режим доступа: http://www.archive.gov.tatarstan.ru. – Дата доступа: 21.09.2014.
5. Гришин, Я. Тальковский Искандер Искандерович. Личное дело и жизнь комдива И. Тальковского / Я. Гришин, Д. Шарафутдинов // [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://nailtimler.com/people_page/people_18t/talkovskiy_iskander_iskanderovich.html. – Дата доступа: 20.09.2014.
6. Гришин, Я. Отчизны верные сыны. О военачальниках – выходцах из древних татарских родов / Я. Гришин, Д. Шарафутдинов. – Казань, 2001. – 130 с.
7. Hrybawa, S. Represje stalinowskie wobec ludności tatarskiej na Białorusi Radzieckiej w latach 1939–1941 / Swiatlana Hrybawa // Studia interkulturowe Europy Środkowo-Wschodniej. – Warszawa. – 2010. – T. 5. – S. 3–10.
8. Бицютко Константин Яковлевич / Русская армия в Великой войне: Картотека проекта. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.grwar.ru/persons/persons.html?id=1107&PHPSESSID=1444a73b4ddc4288666f659fc1961c71. – Дата доступа: 20.09.2014.
9. Исмаилов, Э.О. Золотое оружие с надписью «За храбрость». Списки кавалеров. 1788–1913 / Э.О. Исмаилов. – М.: Старая Басманная, 2007. – 145 с.
10. Романович Александр Ромуальдович / Русская армия в Великой войне: Картотека проекта [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.grwar.ru/persons/persons.html?id=1430 – Дата доступа: 21.09.2014.
11. Kolodzejczyk, A. Jozef Pilsudski a polscy tatarzy / A. Kolodzejczyk // Zycie muzulmanskie. – 1989. – № 1–2. – S. 39–46.
12. Миськевич, А. Татарское меньшинство в Польше в 1918–1939 гг. Общая характеристика, поселения, общественно-профессиональное состояние / А. Миськевич // Татары-мусульмане на землях Беларусі, Літвы і Польшчы: матэрыялы Першай міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. да 600-годдзя татарскага асадніцтва на землях Беларуска-Літоўскай дзяржавы, распачатага пры Вітаўце Вялікім, Мінск, 26–27 сак. 1993 г.: у 3 ч. / Беларус. дзярж. пед. ун-т; рэдкал.: І. Александровіч [і інш.]. – Мінск, 1995. – Ч. 3. – С. 403–449.
13. Юзефович Яков Давыдович / Русская армия в Великой войне: Картотека проекта [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://www.grwar.ru/persons/persons.html?id=697 – Дата доступа: 21.09.2014.


*Материал поступил в редакцию 10.11.14*

***GRIBOVA S.U.* Belarusian Tatars in the I World War**

The present article is dedicated to the participation of representatives of Belarusian Tatars in the I World War as part of Tzar's army. The author focuses on military activities of the Belarusian Tatars generals, provides some biographical data, analyzes the political views and choices in their lives at the turn of the ages.

УДК 28:2–184.3

***Грибова С.В.***

# ПРОБЛЕМА ВЕРЫ И ЗНАНИЯ В ИСЛАМСКОЙ МЫСЛИ

Проблемы разума и знания занимали, и до сих пор занимают, наиважнейшее место в духовной жизни общества. Свидетельством данного тезиса являются известные на весь мир исторические памятники литературы, истории, философии, тексты священных писаний национальных и мировых религий, в которых этим вопросам уделяется особое внимание. Данная статья посвящена анализу проблемы соотношения знания и веры, науки и религии в мусульманском мышлении и миропонимании в контексте преемственной связи прошлого и современного.

Проблемам разума и знания исключительное внимание уделяется в мусульманской литературе, начиная от священных текстов (Коран и Сунна), заканчивая теологической и философской литературой. В частности, американский исследователь Франц Роузентал в своей книге «Торжество знания» упоминает, что в Коране корень слова «знать» (*'Ilm*) вместе с производными от этого словами «знание», «наука» встречаются около 750 раз, т.е. необычайно часто, составляя около 1% его словарного фонда [2]. Ф. Роузентал отмечает, что *'Ilm*, хоть и довольно хорошо переводится с арабского языка как «знание», но русский вариант не может выразить всего фактического и эмоционального содержания *'Ilm*, т.к. *'Ilm* является одной из доминирующих концепций в Исламе, которые дали мусульманской цивилизации её отличительную окраску [1, с. 55]. Роузентал пишет, что нет такой стороны мусульманской духовной жизни, политической и религиозной деятельности мусульман, повседневной жизни рядо-